**Конан, М.** Кожны крок — у нязведанае / М. Конан // Віцебскі рабочы. — 1989. — 18 лют. — С. 1—2.

## КОЖНЫ КРОК – У НЯЗВЕДАНАЕ



Калі б чалавек ведаў, што чакае яго праз год, месяц і нават дзень, то страцілася б асалода жыцця. Без высокай канкрэтнай мэты атрымалася б нейкае суцэльнае чаканне. А яно – расслабляе волю, ператварае ў раба лёсу. І тады знікае асоба, раствараецца ў празаічнай мітусні жыцця характар.

Віктар больш за ўсё не любіў і не любіць «запраграміраваных». І тады, калі працаваў трэнерам у спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школе алімпійскага рэзерву № 1, і цяпер, тут, у СПТВ № 147. Не, канечне, без перспектывы, без заглядвання наперад ні тады, ні цяпер ён не жыве. Але не церпіць дрэнна схаванай перастрахоўкі: а што будзе, як?..

Неяк раз, года паўтара назад, на адным з пасяджэнняў гарадскога савета воінаў-інтэрнацыяналістаў зайшла гаворка аб іх ролі ў выхаванні «цяжкіх» падлеткаў. Дзіма Глінка, тады сакратар камітэта камсамола СПТВ № 147, расказаў аб нялёгкіх лёсах сваіх рабят.

– Трэба дапамога, браткі. Выручайце.

– Мы пойдзем, – рашыў Віктар. – Нас вучылі, і мы павінны аддаць даўгі.

З пасяджэння пайшлі разам з Глінкам. А праз нейкі час Віктар з братам Мікалаем – яны блізняты – ужо з'явіліся ў вучылішчы. Чарговы крок у нязведанае быў зроблен.

– Разумееце, – прызнаецца Віктар, — мы заўсёды з ім разам. На першыя трэніроўкі ў сем год амаль праз увесь горад ездзілі ўдвух, у тэхнікум фізкультуры паступілі адначасова, і ў Афганістане служылі ў адным узводзе. А што са школай алімпійскага рэзерву расстаўся – захацелася самастойнасці. Надакучыла быць другім. Ёсць ужо і свае меркаванні аб спартыўнай падрыхтоўцы рабят, аб трэнерскай рабоце наогул.

– І не шкадуеш?

– Ды некалі было аб гэтым думаць. Мы ж прыйшлі літаральна ў пустую спартзалу.

Мы гутарым у кабінеце намесніка дырэктара вучылішча па вучэбнай рабоце Л. А. Мішурнай, і тая толькі вінавата ківае галавой, маўляў, што ж, так яно і было. А сёння тут – шведскія сценкі, іншыя спартыўныя снарады. Сваімі рукамі браты Якушкіны зрабілі і ўстанавілі абсталяванне

кабінетаў атлетычнай гімнастыкі і бокса. Віктар хутка арганізаваў школу юнага дэсантніка, стаў трэніраваць майстроў і выкладчыкаў у групе здароўя.

– Не хачу перахвальваць, – умешваецца ў размову сакратар партарганізацыі вучылішча А. А. Сасноўскі, — але з прыходам Якушкіных усім: і майстрам, і выкладчыкам – стала неяк крыху лягчэй наладжваць выхаваўчую работу з рабятамі. Вы ж разумееце, вельмі многія з «цяжкіх» сем'яў, бязбацькаўшчына. Цвёрдага мужчынскага характару не адчувалі. Ведаеце, які аргумент я нашым «цяжкім» прыводжу? Вось вы, кажу, зрабіце, як Віктар Якушкін, сальта назад з месца, тады і «качайце» правы!

Віктар слухае ўсё гэта, моршчыцца ад такой непрыкрытай пахвалы і спрабуе перавесці размову ў іншае рэчышча. Сёння як кандыдата ў народныя дэпутаты СССР ад Віцебскай гарадской нацыянальна-тэрытарыяльнай выбарчай акругі № 79 яго хвалююць не проста гэтыя падрабязнасці. На першым месцы яго перадвыбарнай праграмы – кардынальнае паляпшэнне работы з моладдзю наогул. На сёння, па назіраннях Віктара, камсамол з афіцыйнага ператварыўся больш у фармальнага, чым фактычнага лідара. Моладзі цяпер патрэбны абноўленыя арыенціры. Сёння ў школах і тэхнікумах, вучылішчах і інстытутах трэба рыхтаваць не вузкіх спецыялістаў, а людзей заўтрашняга дня, поўнасцю гатовых уступіць у XXI стагоддзе, тых, хто ўмее і думаць, і дзейнічаць па-дзяржаўнаму, а не толькі для сваёй карысці.

А гэтага дабіцца немагчыма, пакуль не будзе на справе, а не на словах перабудавана ўся сфера народнай адукацыі. І ўжо зусім нельга абыходзіцца ў гэтай справе без добрай матэрыяльнай базы. Валодаць камп'ютарам, любіць мастацтва на пальцах не навучыш. Гэта аксіёма.

– А вы ведаеце, – падкідвае факт з жыцця вучылішча Л. А. Мішурная, – мы ўжо больш пяці год вучым рабят прафесіям рэзчыка па дрэву, электразваршчыка ці бульдазерыста, а сваіх майстэрняў не маем.

– Сустрэў я неяк у горадзе хлопца з нашага вучылішча, – падхоплівае «балючую» тэму Віктар, – пытаюся, як справы. А ён што слова, то мат. Аказваецца, на практыцы працуе з раней судзімымі. Яны яго такому навучылі! А хлопцу няма яшчэ і семнаццаці... У майстэрнях мы такое не дапусцілі б.



Якушкін з горыччу гаварыў і аб дрэннай экалагічнай абстаноўцы ў некаторых мікрараёнах горада, і аб неабходнасці, калі яго выберуць народным дэпутатам, дабівацца персанальнай адказнасці за парушэнні законаў аб ахове прыроды. Важнай праблемай у яго перадвыбарнай платформе з'яўляецца і ўсталяванне паўсюдна ў краіне сацыяльнай абароны ўсіх воінаў-інтэрнацыяналістаў. Менавіта ад імя дзяржавы яны выконвалі свой інтэрнацыянальны абавязак у Афганістане, дзяржава і ўстанавіла для былых воінаў ільготы. Але далёка не ўсе і не ўсюды

імкнуцца іх прызнаваць і выконваць. За гэта яшчэ даводзіцца змагацца. А хто, як не самі былыя воіны-інтэрнацыяналісты лепш за іншых ведаюць, што льготы – не нейкая дабрачынная падачка: яны выпакутаваны ў гарах і пустынях далёкага Афганістана, авансам паліты крывёю нашых салдат. Я даўно заўважыў, што ніхто з тых, хто прайшоў школу Афганістана, не любіць успамінаць аб мінулым. Не выключэннем быў і Віктар Якушкін.

–Ён жа і нам нічога толкам не гаворыць, – расказвае Марыя Паўлаўна, маці Віктара і Мікалая. – Помню, было гэта яшчэ ў 1980 ці 1981 годзе. Прынеслі ў наш цэх газету «Красная звезда», чытаюць. А там здымак трох нашых салдацікаў. І Віктар разам з імі. Подзвіг яны здзейснілі. А які – дакладна не пішуць. Тады нельга, відаць, было. Я потым пыталася ў сына, ды так да канца і не высветліла.



Праўда, мне яго таварышы, як прыязджалі да нас, гаварылі, што ў адным з баёў, калі суседняе падраздзяленне трапіла ў засаду, Віктар з групай байцоў пайшоў на выручку. Яны тады знішчылі душманскую засаду і іх кулямёт, які не даваў нашым байцам нават падняцца. Ці так было, пытаюся ў сына. Так, кажа ён. А яшчэ ж яны з Колем выратавалі на полі бою свайго таварыша Андрэя Усачова, калі таго кантузіла. Цяпер ён у міліцыі працуе.

Рэдка мне пісалі адтуль сыны, і ўсё па чарзе. Адзін раз Віця піша, што, маўляў, быў такі выпадак, калі іх група байцоў засталася на некалькі сутак зусім без боепрыпасаў і харчавання. Пакружыўся над імі наш верталёт і скінуў усё, што трэба. А Віця піша, што ніколі не еў такога смачнага хлеба – ён быў яшчэ цёплы... Ну і наплакалася ж я тады. І наогул, колькі слёз выплакала за тыя два гады па маіх хлопчыках, і не злічыць. Добра, што хоць жывыя і здаровыя вярнуліся. Успаміны маці, яе шчырыя, душэўныя словы можна слухаць доўга. Відаць, толькі мацярынскае сэрца можа так востра адчуваць і перажываць кожны ўчынак, кожны крок свайго дзіцяці. А яны ў сыноў заўсёды былі няпростымі, іх крокі па жыцці. І ў спорце, і на службе, ды і зараз амаль кожны з іх – у нязведанае. Кожны водпуск Віктар разам з братам і сябрамі едзе на тыдзень-другі ў горы. Такі турызм дае магчымасць падтрымліваць спартыўную форму, псіхалагічна не расслабляцца.

Ім, «афганцам», выпала на долю столькі выпрабаванняў, якіх хапіла б не на адно «спакойнае» пакаленне. Іх жыццёвы вопыт цяжка з чым-небудзь сувымераць. Нездарма ж у народзе кажуць, што жыццё – гэта не колькасць пражытых гадоў, а тое, што з іх запомнілася, што здзейсніў важнага чалавек. Воіны-інтэрнацыяналісты прымусілі ўсіх нас зусім па-іншаму глянуць на саміх сябе, на нашы праблемы, пераацаніць ранейшыя каштоўнасці і прыярытэты. Яны – наша сённяшняе сумленне, нашы боль і гонар. Яны – часцінка біяграфіі ў гісторыі краіны. А гісторыю не перапішаш нанова. Кожны наш крок у яе – нязведаны. Як і вынікі будучых выбараў. Як і само жыццё.

**М. Конан, фота А. Хітрова**